Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2012-09-21

# Танказнаўства на сучасным этапе

## ПА ВЫНІКАХ МІЖНАРОДНАЙ НАВУКОВАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ Ў ІНСТЫТУЦЕ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА І ЯНКІ КУПАЛЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ

**Яўген ГАРАДНІЦКІ**

Навуковая канферэнцыя "Максім Танк у дыялогу славянскіх літаратур: традыцыі, наватарства, нацыянальная адметнасць", якая адбылася 17 верасня ў адным са старэйшых акадэмічных інстытутаў Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў, была прысвечана стагадоваму юбілею класіка сучаснай літаратуры народнага паэта Беларусі Максіма Танка. Навукоўцы з усёй краіны і з-за яе межаў сабраліся разам, каб падсумаваць вынікі развіцця танказнаўства як адметнага адгалінавання беларускай літаратуразнаўчай навукі, вызначыць новыя, перспектыўныя напрамкі даследавання творчасці вялікага нацыянальнага паэта.

Адкрыў канферэнцыю і вёў пленарнае пасяджэнне дырэктар Інстытута мовы і літаратуры, член-карэспандэнт, доктар філалагічных навук, прафесар А. Лукашанец. У сваім выступленні ён ахарактарызаваў ролю і месца паэзіі М. Танка не толькі ў нацыянальнай літаратуры, але і ў еўрапейскім, сусветным літаратурным кантэксце. Прамоўца распавёў пра навуковыя здабыткі даследчыкаў творчасці паэта, пра ўнёсак акадэмічнай навукі ў танказнаўства. У прыватнасці, ім было падкрэслена вялікае значэнне для далейшага развіцця гэтага напрамку літаратуразнаўства выхаду ў свет Збору твораў Максіма Танка ў 13 тамах. Гэтае выданне, ажыццёўленае ў адпаведнасці з распараджэннем Прэзідэнта краіны, было падрыхтавана супрацоўнікамі Інстытута мовы і літаратуры, якія правялі тэксталагічную апрацоўку ўсіх даступных на гэты час твораў паэта. Дадзены Збор твораў — першае тэксталагічна апрацаванае і каменціраванае, навукова-масавае выданне твораў Максіма Танка. Таксама А. Лукашанец адзначыў унёсак, зроблены ў падрыхтоўку Збору У. Мархелем, які ўзначальваў творчую групу тэкстолагаў з самага пачатку працы і якому належыць распрацоўка канцэпцыі выдання, яго фармату і спосабаў арганізацыі матэрыялаў. Паколькі знаны даследчык па стане здароўя не змог да канца кіраваць гэтым праектам і не здолеў прысутнічаць на канферэнцыі, было аднадушна вырашана даслаць яму ад імя ўдзельнікаў падзяку і віншаванне з выхадам Збору твораў.

У працы канферэнцыі ўзялі ўдзел і выступілі з прывітальнымі словамі пісьменнікі Георгій Марчук, Мікола Мятліцкі, Анатоль Вярцінскі. Сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі Г. Марчук расказаў пра працу пісьменніцкай арганізацыі па прапагандзе творчай спадчыны вялікага паэта, пра клопаты за пашырэнне беларускага мастацкага слова, узмацненне яго ўплыву на духоўны стан грамадства. У яскравай, эмацыянальнай прамове М. Мятліцкага была акрэслена велічная постаць Танка, дзейсць яго паэзіі. Галоўны рэдактар часопіса "Полымя" звярнуў увагу прысутных на рэдактарскую дзейнасць М. Танка, які ў свой час узначальваў гэтае аўтарытэтнае выданне. Паэт А. Вярцінскі падзяліўся сваімі ўспамінамі пра М. Танка, расказаў пра яго асобу.

На пленарным пасяджэнні выступілі з дакладамі найбуйнейшыя беларускія літаратуразнаўцы, якія з розных бакоў ахарактарызавалі чалавечую постаць і высокую эстэтычную вартасць паэзіі М. Танка.

Да тэмы "Паэт і яго час" звярнуўся літаратуразнаўца і пісьменнік, акадэмік У. Гніламёдаў. Ён панарамна і аб'ёмна прадставіў танкаўскую паэзію як мастацкі феномен, вызначыў яе гуманістычную, чалавеказнаўчую сутнасць. Член-карэспандэнт, доктар філалагічных навук, прафесар С. Лаўшук у сваім дакладзе "Мудрыя парады класіка" спыніўся на момантах, якія характарызуюць М. Танка найперш як чалавека. Доктар філалагічных навук, прафесар Т. Шамякіна ў дакладзе "Метафізічная Беларусь у вобразным слове Максіма Танка" прааналізавала адметнасць паэтыкі творцы, яе сувязь з нацыянальным светабачаннем. Доктар філалагічных навук М. Тычына суаднёс паэзію М. Танка з эпохай "тэктанічных зрухаў" у еўрапейскіх літаратурах. Доктар філалагічных навук В. Бароўка ахарактарызавала эстэтычную праблематыку "Ліасткоў календара" М. Танка. Пра багацце танкаўскіх матэрыялаў у фондах БДАМЛМ гаварыла дырэктар архіва-музея Г. Запартыка. Кандыдат філалагічных навук С. Калядка, кіраўнік тэксталагічнай групы па выданні Збору твораў М. Танка, расказала пра працу над творамі паэта.

Багата цікавых думак было агучана на трох секцыях канферэнцыі, у працы якіх узялі ўдзел як вопытныя даследчыкі, так і навуковая моладзь. Вынікі канферэнцыі паказалі, што ў даследчыкаў творчасці Максіма Танка — значны творчы патэнцыял, а ў танказнаўства добрая будучыня.